# ПАДТРЫМКА – ПАШЫРЭННЕ ПРАВОЎ – АБАРОНА

## ПРАВААБАРОНЦАЎ

**Рэзалюцыя 22/6 Савета па правах чалавека ААН ад 21 сакавіка 2013 года ўстанаўлівае прынцыпы і стандарты для дзяржаў дзеля стварэння спрыяльных умоў для праваабаронцаў**

---

**Савет па правах чалавека ААН**

- прызнае, што праваабаронцы адыгрываюць важную ролю на мясцовым, нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях у галіне заахвочвання і абароны правоў чалавека;
- сур'ёзна занепакоены тым, што ў некаторых выпадках нацыянальная бяспека і заканадаўства па барацьбе з тэрарызмам і іншыя захады, як законы, што рэгулююць арганізацыі грамадзянскай супольнасці, неналежным чынам выкарыстоўваліся для ўздзеяння на праваабаронцаў або сталі перашкодай для іх працы і паставілі пад пагрозу іх бяспеку спосабамі, якія супярэчаць міжнароднаму праву;
- прызнае тэрміновую неабходнасць разгляду і прыняцця канкрэтных захадаў па прадухіленні і спыненні выкарыстання заканадаўства з мэтай стварэння неабгрунтаваных перашкодаў або абмежаванняў для магчымасцяў праваабаронцаў весці сваю працу, у тым ліку шляхам правядзення агляду і, пры неабходнасці, зменаў адпаведнага заканадаўства і яго ажыццяўлення, каб забяспечыць захаванне міжнароднага права ў галіне правоў чалавека.

---

### НЕ КРЫМІНАЛІЗАВАЦЬ ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАВААБАРОНЦАЎ

Законы не павінны крыміналізаваць або дэлегітымізаваць працу і дзейнасць праваабаронцаў і іх права карыстацца ўніверсальнымі правамі чалавека.

### АКАЗВАЦЬ ПУБЛІЧНУЮ ПАДТРЫМКУ ПРАВААБАРОНЦАМ

Дзяржавы і лідэры ва ўсіх сектарах грамадства павінны публічна прызнаць важную і законную ролю праваабаронцаў у прасоўванні правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства закона і пазбягаць іх публічнага асуджэння.

### ПАЗБЯГАЦЬ ПРАВАВЫХ АБМЕЖАВАННЯЎ

Усе прававыя нормы, якія закранаюць праваабаронцаў, мусяць быць дакладна вызначанымі, не дазваляць спынення дзеяння і не мець зваротнай сілы, а любое абмежаванне мусіць быць законным, прапарцыйным, недыскрымінацыйным і неабходным у дэмакратычным грамадстве.

### САДЗЕЙНІЧАЦЬ МІРНЫМ ПРАТЭСТАМ

Праваабаронцы могуць выконваць сваю ролю і не мусяць станавіцца ахвярамі парушэнняў правоў чалавека ў кантэксце мірных пратэстаў або злоўжывання крымінальным і грамадзянскім пераследам ці пагрозаў такіх дзеянняў. Заканадаўства аб грамадскай маралі павінна адпавядаць міжнароднаму праву ў галіне правоў чалавека.

### ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ДОСТУП ДА СМІ

Аказваць падтрымку і садзейнічаць на нацыянальным узроўні доступу праваабаронцаў да выкарыстання любых інфармацыйных тэхналогій і сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку радыё, тэлебачання і Інтэрнэта.

### НЕ ПРЫБЯГАЦЬ ДА АБМЕЖАВАННЯЎ, ЗВЯЗАНЫХ З ГРАМАДСКАЙ БЯСПЕКАЙ

Заканадаўства аб дзяржаўнай бяспецы і грамадскім парадку павінна ўтрымліваць выразна вызначаныя палажэнні, у тым ліку прынцып недыскрымінацыі, каб пазбегнуць яго выкарыстання дзеля стварэння перашкодаў або абмежавання ажыццяўлення любых правоў чалавека.

### ГАРАНТАВАЦЬ СВАБОДУ АСАЦЫЯЦЫЙ

У выпадку, калі існуе парадак рэгулявання рэгістрацыі арганізацый грамадзянскай супольнасці, забяспечыць, каб ён з'яўляўся празрыстым, даступным, недыскрымінацыйным, аператыўным і недарагім.

### ПАВАЖАЦЬ АЎТАНОМІЮ НДА

Забяспечыць, каб усе прававыя палажэнні, якія закранаюць праваабаронцаў, былі дакладна вызначанымі, не дазвалялі спынення дзеяння і не мелі зваротнай сілы, а патрабаванні да справаздачнасці не блакіравалі функцыянальную аўтаномію НДА.

### ПАЗБЯГАЦЬ АБМЕЖАВАННЯЎ ДОСТУПУ ДА ФІНАНСАВАННЯ

Законы не павінны накладаць абмежаванні на патэнцыйныя крыніцы фінансавання дзейнасці ў галіне правоў чалавека, за выключэннем тых, якія звычайна прадугледжваюцца ў выпадку любой іншай дзейнасці, не звязанай з правамі чалавека, для забеспячэння транспарэнтнасці і справаздачнасці.

### ПАЗБЯГАЦЬ АБМЕЖАВАННЯЎ ДОСТУПУ ДА ЗАТРЫМАНЫХ

Забяспечыць доступ адпаведных міжнародных органаў і НДА да асобаў, затрыманых паводле заканадаўства аб барацьбе з тэрарызмам або іншага заканадаўства ў галіне нацыянальнай бяспекі, а таксама прадастаўленне ім юрыдычнай дапамогі.

### ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ СУДДЗЯЎ

Судовая сістэма павінна быць незалежнай, бесстаронняй і кампетэнтнай, каб эфектыўна перагледзець заканадаўства, якое закранае працу і дзейнасць праваабаронцаў.

### ПАВАЖАЦЬ ВЯРШЭНСТВА ЗАКОНА

Павінны быць прыняты захады дзеля прадухілення выкарыстання сумнеўных доказаў, неабгрунтаваных расследаванняў і працэдурных затрымак, у тым ліку па крымінальных справах супраць праваабаронцаў.

### ГАРАНТАВАЦЬ СВАБОДУ ВЫКАЗВАННЯ МЕРКАВАННЯЎ

Вітаецца дэкрыміналізацыя дыфамацыі. Забяспечыць, каб пакаранне за паклёп было абмежавана мэтай забеспячэння прапарцыйнасці, а палажэнні не перашкаджалі б прыцягненню да адказнасці службовых асобаў.

### ПРЫМАЦЬ РОЗНЫЯ МЕРКАВАННІ

Дзяржавы павінны забяспечыць, каб асаблівыя меркаванні маглі мірна выказвацца.

### ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ДОСТУП ДА ІНФАРМАЦЫІ

Забяспечыць, каб інфармацыя, якой валодаюць дзяржаўныя органы, раскрывалася на папераджальнай аснове і была празрыстай, а адназначныя законы прадугледжвалі агульнае права запытваць і атрымліваць такую інфармацыю, асабліва ў выпадку грубых парушэнняў правоў чалавека.

### АБАРАНЯЦЬ ЖАНЧЫН-ПРАВААБАРОНЦАЎ

Дзяржавы павінны ўлічваць гендэрную перспектыву для стварэння ўмоў, якія выключаюць сістэмную і структурную дыскрымінацыю і гвалт, з якімі сутыкаюцца жанчыны-праваабаронцы.

### АБАРАНЯЦЬ АБАРОНЦАЎ МЕНШАСЦЯЎ

Заканадаўства не мусіць пераследаваць дзейнасць па абароне правоў асоб, якія належаць да меншасцяў або падтрымліваюць перакананні меншасцяў.

### ПАДТРЫМЛІВАЦЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ААН

Супрацоўніцтва грамадзянскай супольнасці з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і яе механізмамі павінна падтрымлівацца на празрыстай, бесстаронняй і недыскрымінацыйнай аснове.

### ПАКЛАСЦІ КАНЕЦ УСІМ ФОРМАМ РЭПРЭСІЙ

Праваабаронцы, у тым ліку члены іх сем'яў, павінны карыстацца належнай абаронай ад запалохвання і рэпрэсій за супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, і мусіць быць пакладзены канец беспакаранасці за такія дзеянні.

### ПАВЕДАМЛЯЦЬ АБ ХОДЗЕ РЭАЛІЗАЦЫІ АБАРОНЫ ПРАВААБАРОНЦАЎ

Дзяржавы павінны ўключаць інфармацыю аб захадах, прынятых для стварэння бяспечных і спрыяльных умоў для праваабаронцаў, у свае паведамленні для міжнароднай супольнасці.

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK